**Клепча П.**

# СТАЛА ПОДЗВІГАМ ЖЫЦЦЁ

***Рыгор Аляксандравіч нарадзіўся 22 лютага 1902 года ў беднай сялянскай сям'і ў вёсцы Ізабеліна Кіраўскага раёна. Там, сярод ціхіх палёў і лясоў, прайшло яго дзяцінства. Вучыўся спачатку ў Ізабеліна, а затым у Паўлавіцкай школе. Меў добрыя здольнасці па арыфметыцы. Ужо ў першым класе мог рашаць задачы за чацвёрты.***

Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі Рыгор адразу ўключыўся ў актыўную барацьбу за ўмацаванне Савецкай улады, становіцца старшынёй мясцовага камітэта беднаты. У 1924 годзе Р. Худалеева прызываюць у Чырвоную Армію. З гэтага часу і да канца жыцця ён неразрыўна звязвае свой лёс з Савецкімі Узброенымі Сіламі. Службу пачынае чырвонаармейцам, затым малодшым камандзірам. У арміі працягвае вучыцца ў вячэрняй сярэдняй школе. У 1926 годзе як лепшага воіна часці яго прымаюць у рады РКП(б). У канцы 20-х гадоў па рэкамендацыі камандавання і партыйнай арганізацыі старшына Худалееў Р. А. накіроўваецца на вучобу ў Мінскае артылерыйскае вучылішча. У 1930 годзе паспяхова яго заканчвае і становіцца афіцэрам-артылерыстам.

З 1930 па 1939 гады служыць у 37 артпалку ў гарадах Бабруйск, Клінцы, Рэчыца на пасадах камандзіра ўзвода, камандзіра батарэі, начальніка палкавой школы малодшых камандзіраў.

Ішоў час. На захадзе і ўсходзе нашай Радзімы наплывалі чорныя хмары вайны. 1 верасня 1939 года пачалася другая сусветная вайна – фашысцкая Германія напала на Польшчу. Савецкі ўрад аддаў загад вызваліць Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну, якія знаходзіліся ў складзе Польшчы.

Капітан Р. Худалееў прымаў удзел у гэтым паходзе па маршруту Лунінец, Пінск, Кобрын, Брэст. У верасні – лістападзе 1939 года яго назначаюць першым савецкім камендантам горада Брэста.

Вясной 1940 года капітана Худалеева пераводзяць у Мінск (штаб корпуса). Затым назначаюць начальнікам штаба 462 артпалка. Восенню гэтага ж года артылерыйскі полк перакідваецца ў Бабруйск, адкуль 22 чэрвеня 1941 года ў поўным складзе адпраўляецца на фронт Вялікай Айчыннай вайны.

Як начальнік штаба гэтай часці, ён унёс значны ўклад ва ўмацаванне яе баявой гатоўнасці ў перадваенны час, што ў шмат чым забяспечыла яе поспехі ў суровых бітвах першых месяцаў вайны. Баявы шлях 462 артпалка пачынаецца са станцыі Лясная, заходней Баранавіч, куды ён прыбыў з Бабруйска ўначы з 23 на 24 чэрвеня.

Нягледзячы на бесперапынныя баі, 462 артполк амаль не нёс страт баявой тэхнікі. Першую гармату полк страціў восенню 1941 года на рацэ Дзясна.

Баявое хрышчэнне палка адбылося 25 чэрвеня пры пераходзе ў раён Слуцка і асядланні шашы Брэст – Масква. У раёне Нясвіж – Стаўбцы нечакана была сустрэта буйная калона гітлераўцаў: танкі, бронемашыны, матацыклы. Камандаванне палка прыняло рашэнне атакаваць ворага. Дзве батарэі адкрылі агонь па фашыстах. Праз некалькі хвілін там, дзе палалі варожыя машыны, да неба валілі клубы чорнага дыму – гарэла падбітая нямецкая тэхніка. Шлях на Слуцк быў свабодным.

Камандаванне Заходняга фронту пасля цяжкіх баёў усходней Мінска вырашыла арганізаваць новы рубеж абароны па рэках Бярэзіна, Днепр. Сюды накіроўваліся войскі, якія прыбылі з цэнтральных раёнаў краіны, а таксама мясцовыя падраздзяленні. 462 артполк быў адзінай часцю, якая прыйшла на Бярэзіну ў поўным складзе.

У канцы верасня капітан Худалееў як адзін з лепшых афіцэраў-артылерыстаў адзываецца ў Маскву для назначэння камандзірам палка навейшай зброі Чырвонай Арміі – гвардзейскіх рэактыўных мінамётаў "Кацюша". На гэтым заканчваецца яго баявы шлях у складзе 462 артпалка.

Але з-за адсутнасці неабходнай колькасці "Кацюш" па асабістай просьбе Худалеева назначаюць камандзірам 888 палка дывізіённай артылерыі, які ў гэты час фарміраваўся ў Паволжы. З гэтым палком ён прымаў удзел у бітве пад Масквой.

Летам 1944 года Чырвоная Армія пачала наступленне адразу на некалькіх франтах. Пачалася і вядомая аперацыя "Баграціён". 306 стралковая дывізія, у складзе якой служыў Р. А. Худалееў, уваходзіла ў склад 43 арміі Першага Прыбалтыйскага фронту. Перад ёй стаяла задача прарваць доўгатэрміновую і добраўмацаваную абарону праціўніка, а затым імклівым ударам выйсці да ракі Заходняя Дзвіна, фарсіраваць яе і тым самым забяспечыць акружэнне гітлераўцаў у раёне Віцебска. 24 чэрвеня 306 дывізія прыступіла да фарсіравання Заходняй Дзвіны. Для пераправы праз раку былі прыгатаваны лодкі, плыты. Байцы чакалі сігнала, каб спусціць іх на ваду і плыць да супрацьлеглага боку.

І тут зноў асаблівую ролю адыгралі артылерысты. Калі была пададзена каманда на фарсіраванне, яны абрушылі на пазіцыі ворага агонь сакрушальнай сілы. Крутыя схілы, дзе акапаліся фашысты, зніклі з вачэй у пылу і дыме ад разрываў гарматных снарадаў. Пад гэтым агнём, як за сталёвым шчытом, пяхотныя палкі дывізіі імкліва пайшлі ўперад і першымі аказаліся на паўднёвым беразе Заходняй Дзвіны. За бліскучае выкананне заданняў камандавання ў гэтай аперацыі, праяўленыя мужнасць, гераізм, адвагу палкоўнік Худалееў Р. А. удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Восенню 1944 года Худалееў прызначаецца камандзірам асобнага артылерыйскага злучэння навейшых дальнабойных стоміліметровых гармат. З гэтым злучэннем у складзе вядомай 5 гвардзейскай танкавай арміі ён удзельнічае ў акружэнні курляндскай групоўкі нямецка-фашысцкіх войск, у вызваленні шматлікіх польскіх гарадоў, праходзіць праз знакамітае Грунвальдскае поле. Закончыў вайну гвардыі палкоўнік Р. А. Худалееў у Берліне.

Радзіма высока ацаніла яго асабістае бясстрашша, стойкасць і рашучасць у баях, уменне правільна кіраваць войскамі і дабіцца перамогі над ворагам у любых абставінах. Акрамя Залатой Зоркі Героя Савецкага Саюза ён узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі, а таксама шматлікімі медалямі.

Пасля вайны Худалееў працягваў службу ў розных злучэннях войск Беларускай ваеннай акругі і ў Прыбалтыцы. Адначасова прайшоў падрыхтоўку на Вышэйшых акадэмічных курсах пры ваеннай артылерыйскай акадэміі імя Дзяржынскага.

1952 год. Зноў Германія. Група савецкіх войск. Р. А. Худалееў камандуе артылерыяй аб'яднання. Але з прычыны цяжкай хваробы ў 1955 годзе ён выходзіць у адстаўку. 4 чэрвеня 1964 года яго сэрца перастала біцца. Пахаваны Р. А. Худалееўу Мінску.

У 1968 годзе Паўлавіцкай школе было прысвоена яго імя. Вучні школы ўстанавілі сувязь з сынам Героя Савецкапа Саюза Р. А. Худалеева інжынер-палкоўнікам Барысам Рыгоравічам Худалеевым. Ён некалькі разоў прыязджаў на сустрэчу з вучнямі і педкалектывам нашай школы, прадставіў матэрыялы для школьнага музея баявой славы. Гаворачы пра бацьку, сын славутага земляка аднойчы адзначыў, што ў яго подзвігах няма нічога незвычайнага, гераізм яго не тоіць у сабе нічога загадкавага і дзіўнага. Стала незвычайным подзвігам само яго звычайнае жыццё.

**Клепча, П. Стала подзвігам жыццё / П. Клепча // Кіравец (Кіраўск). — 2002. — 23 лютага. — С. 2.**